# Прамова тав. Н. Ф. ГІКАЛО

## *на ўсенародным мітынгу 11 ліпеня 1936 года*

Таварышы рабочыя, калгаснікі, совецкая працоўная інтэлігенцыя, сыны і дочкі беларускага народу!

Тысячагадовая гісторыя беларускага народу запоўнена крывавымі старонкамі прыгнёту і заняволення. З агнём і мячом праходзілі беларускую зямлю орды татар, літоўскія князі разам з беларускімі князямі прыгняталі беларускі народ, польскія магнаты, паны і шляхта палілі, крыжом і мячом насаджалі каталіцтва і польскія парадкі... Нават лівонскія і тэўтонскія рыцары і мечаносцы тапталі зямлю беларускую. Якіх толькі зграй прыгнятальнікаў не бачыла беларуская зямля!

І правільна выказана ў пісьме беларускага народу вялікаму Сталіну:

Ішоў год за годам, ішоў век за векам,
А мы пад няволяй, пад вячыстым здзекам.
Паны і жандары, ды ксяндзы з папамі
На шыях народных селі груганамі.

І турмы, і катаргу, і бізун царскага самаўладства паспытаў беларускі народ, але асабліва свежа ў памяці беларускага народу белапольская акупацыя, як чорная здань бяспраўя, пажараў, пагромаў, слёз і крыві ўдоў і дзяцей, закатаваных дзесяткаў і сотняў байцоў беларусоў, яўрэяў за справу совецкай улады.

Пуцяводнай зоркай для беларускага народу стаў вялікі пролетарскі соцыялістычны Кастрычнік.

Стаўшы цвёрда на шлях ажыццяўлення ўказанняў Леніна — Сталіна, беларускі народ з брацкай дапамогай вялікага рускага народу і гераічнай Чырвонай арміі разбіў ланцугі акупацыі і балзёра і смела ў сям'і народаў вялікага Совецкага Саюза пачаў будаваць новае радаснае жыццё.

І сёння ў пісьме да вялікага Сталіна беларускі народ спявае і славіць шлях, пройдзены ім, шлях творчай будоўлі справы соцыялізма, стварэння і росквіту культуры нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу.



Прыклад гэтаму — беларусы — кіраўнікі партыйнага, гаспадарчага, дзяржаўнага жыцця Совецкай Беларусі. Прыклад гэтаму — ордэнаносцы Беларусі. Прыклад гэтаму і паэты, якія так цёпла і прыгожа напісалі песню-паэму вялікаму Сталіну ад народу беларускага.

Беларускі народ можа запэўніць народы вялікага Совецкага Саюза, ВКП(б), Саюзны совецкі Ўрад: тт. Молатава, Калініна, першага маршала Варашылава і вялікага Сталіна, што ён не дапусціць, каб совецкія граніцы на захадзе пераступіла нага ворага.

Беларускі народ ганарыцца поспехамі сваёй соцыялістычнай будоўлі, росквітам сваёй культуры, але беларускі народ ведае, што зазнавацца нельга і што тут на мяжы з Захадам у асаблівасці трэба быць празорлівым, пільным, трэба ўмець бачыць і трэба ўмець знішчаць ворага.

Народ беларускі ведае, што за рубяжом частка беларускага народу і іншыя народы капіталістычных дзяржаў да сёнешняга дня скаваны ланцугамі рабства, церпяць уціск,

...шле свае палкае прывітанне вялікаму народу Совецкага Саюза, гераічнаму рускаму народу, вялікай партыі большэвікоў, партыі Леніна — Сталіна.

Беларускі народ сёння паслаў свае прывітанне і народнае дзякуй вялікаму Сталіну і за гэта прывітанне галасавалі ўсе працоўныя Совецкай Беларусі. Гэта прывітанне сёння мільёны людзей Совецкага Саюза чытаюць разам з беларускім народам. Сёння беларускі народ мільёнамі галасоў паўтарае імя вялікага друга народаў, генія чалавецтва, правадыра-празарліўца, які вядзе народы Совецкага Саюза да шчаслівага, радаснага, светлага жыцця — Сталіна.

Няхай жыве непарушная сталінская дружба народаў!

Няхай жыве ВКП(б) — перадавы атрад працоўных Совецкага Саюза!

Няхай жыве вялікі і любімы друг народаў Совецкага Саюза, геніяльны правадыр працоўных свету — наш Сталін!

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы